Вынікі візіту ad limina Apostolorum 2018

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч і Ангеліна Пакачайла
18.02.2018 00:00



Храналогія падзей З 31 студзеня па 7 лютага ў Ватыкане праходзіў 4-ты ў гісторыі Касцёла ў Беларусі візіт біскупаў ad limina Apostolorum. Рэдакцыя “Слова Жыцця” распавядае, як гэта было і якую ацэнку атрымаў наш Касцёл у ведамствах Святога Пасаду.

31 студзеня

Біскупы прынялі ўдзел у агульнай аўдыенцыі Святога Айца Францішка на плошчы св. Пятра. Традыцыйна пасля папскай катэхезы прысутныя іерархі з розных частак свету, у тым ліку з Беларусі, мелі магчымасць асабіста прывітаць Пантыфіка і абмяняцца з ім некалькімі словамі. †

1 лютага

Біскупы афіцыйна пачалі свой візіт з малітвы ў Ватыканскіх гротах у інтэнцыі Беларусі і яе жыхароў. На магіле апостала Пятра ў пячорах старажытнага некропаля іерархі цэлебравалі св. Імшу. На заканчэнне ў цішыні памаліліся перад грабніцамі св. Яна Паўла II і св. Язафата Кунцэвіча.

Затым біскупы прынялі ўдзел у прыватнай аўдыенцыі са Святым Айцом Францішкам. У ходзе сустрэчы біскуп Гродзенскі Аляксандр Кашкевіч паведаміў, што Гродзенская дыяцэзія не так даўно адзначала юбілей 25-годдзя свайго заснавання, а ў мінулым годзе распачала гістарычную падзею, якой з’яўляецца I Дыяцэзіяльны сінод. “Няхай сінадальныя пасяджэнні паспрыяюць таму, каб Евангелле для вернікаў дыяцэзіі стала больш зразумелым, а чалавек быў бліжэй да Пана Бога і Яго ласкі, якую Той яму штодзённа спасылае”, – пажадаў Пантыфік.

Падчас сустрэчы іерархі размаўлялі з Папам аб папярэдніх пакаленнях, заслужаных і руплівых святарах, дзякуючы якім вера на нашых землях не загінула, а таксама аб пакліканнях, фармацыі і жыцці святароў, адносінах з дзяржавай і іншымі веравызнаннямі. Святы Айцец выказаў вялікую зацікаўленасць рэлігійным жыццём вернікаў і, разам з тым, высока ацаніў мясцовыя душпастырскія ініцыятывы.

Вынікі візіту ad limina Apostolorum 2018

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч і Ангеліна Пакачайла
18.02.2018 00:00







За апошнія 9 гадоў ад моманту апошняга візіту епіскапату Беларусі ad limina Apostolorum сітуацыя